Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ВЕРАСНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №172 (28536)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

З горада ў вёску

Мірскі замак — сваімі рукамі

Зімой не замерзнем

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:

«Віртуальнымі карыстальнікамі нашай Нацыянальнай бібліятэкі сёння з'яўляюцца жыхары 111 краін. Практычна кожны пяты віртуальны карыстальнік — іншаземец. Гэта жыхары Расіі, Украіны, Казахстана, ЗША, Германіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Малдовы, Узбекістана, Вялікабрытаніі і іншых краін. Іх колькасць з моманту пераезду бібліятэкі ў новы будынак у 2006 годзе павялічылася ў 18 разоў і на 1 жніўня 2017-га складае больш за 86 тысяч. Агульная ж колькасць карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі складае 163 тысячы, штогод ім выдаецца каля 2,5 млн экзэмпляраў дакументаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.09.2017 г.

Долар ЗША	1,9242 ▼
Еўра	2,2960 ▲
Рас. руб.	0,0335 ▲
Укр. грыўня	0,0740 ▼

ISSN 1990 - 763X

ЧАС ВУЧЫЦЦА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Выпрабавана на сабе

НЕ РАСКОША, А СРОДАК ПЕРАМЯШЧЭННЯ

Уласны аўтамабіль больш не патрэбны?

З 24 жніўня ў Мінску запрацаваў першы ў нашай краіне сэрвіс па каршэрынгу (кароткатэрміновай арэндзе аўтамабіляў) Drivetime. Скарыстацца ім можна, калі ў вас ёсць смартфон, актыўная банкаўская карта і, вядома, вадзіцельскае пасведчанне. Наш карэспандэнт пратэсціраваў навінку і высветліў, ці зможа такі сэрвіс навязаць барацьбу таксі, а таксама ці ёсць сэнс адмаўляцца ад уласнага аўто.

СТАР. 13

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Беражыце сябе!

Пачытайце састаў ёгурту, які вы купляеце...

Людзі любяць салодкае і салёнае, і вытворцы ахвотна ідуць ім у гэтым насустрач. Як паўплываць на сітуацыю?

Ужо даўно медыкі б'юць трывогу: сучасныя людзі залішне ўжываюць солі, цукру, тлушчаў. І частка віны за гэта ляжыць у тым ліку і на сучаснай харчовай прамысловасці, якая думае не пра наша з вамі здароўе, а пра тое, каб прадукцыя «разляталася» з паліц. Таму ў каўбасу і хлеб ва ўсім свеце кладуць у некалькі разоў больш солі, чым патрабуецца, а ў ёгурт і кетчуп сыплюць цукру больш, чым сярэдні чалавек дадае ў гарбату. Да чаго гэта прыводзіць, а таксама пра спробы паўплываць на харчовых гігантаў, мы гутарым са старшынёй Беларускай асацыяцыі ўрачоў, намеснікам кіраўніка Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Дзмітрыем ШАЎЦОВЫМ.

Мы ўсе ведаем пра шкоду гарэлкі, віна і цыгарэт. Але вось што датычыцца, напрыклад, солі... Людзі яе выкарыстоўваюць спакон веку. І мы не думаем пра тое, што яна можа выклікаць незваротныя змены ў арганізме, якія павольна назапашваюцца і ўрэшце могуць прывесці да катастрофы. Тое ж самае датычыцца і цукру, і маргарыну...

— Сёлета я быў у Маскве на круглым стале Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), дзе ўзнімалася пытанне прафілактыкі неінфекцыйных захворванняў, якія з'яўляюцца бічом нашага часу. Вельмі шмат дакладаў спецыялістаў было прысвечана харчаванню, — расказвае Дзмітрый Шаўцоў. — Цяпер СААЗ лічыць, што ёсць усе перадумовы на першае месца сярод усіх фактараў рызыкі паставіць соль, а ўжо потым — алкаголь і тытунь.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Урад

ЗБУДАВАЦЬ У ЧАС

Старшыня Саўміна праверыў гатоўнасць аб'ектаў да прыняцця Еўрагульняў—2019

Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ даручыў завяршыць у тэрмін будаўніцтва аб'ектаў у Мінску, якія будуць задзейнічаны пры правядзенні II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе ў Беларусі.

Як паведаміла прэс-служба Савета Міністраў, на пляцоўцы будаўніцтва Студэнцкай вёскі кіраўніку ўрада далажылі аб ходзе ўзвядзення самага вялікага інтэрната ў комплексе, разлічанага на пражыванне 1800 чалавек. Таксама ў Студэнцкай вёсцы да Еўрагульняў з'явіцца павільён для арганізацыі харчавання афіцыйных удзельнікаў спаборніцтваў. Андрэй Кабякоў даручыў скончыць будаўніцтва інтэрната ў снежні 2018 года. «Усе неабходныя фінансавыя сродкі ёсць, проста трэба працаваць. Снежань 2018 года — і ні днём больш, ніякага плана па ўвозе на 2019 год быць не можа. Да канца 2018-га аб'ект павінен быць гатовы пад ключ, з мэбляй», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. На пляцоўцы павінен быць арганізаваны штодзённы рэжым працы, дадаў ён.

Прэм'ер-міністр таксама азнаёміўся з ходам будаўніцтва новага будынка Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту на скрыжаванні вуліц Ціміразева і Нарачанскай. Цяпер будаўнічая гатоўнасць аб'екта складае каля 50%. Пазначаны прэм'ер-міністрам тэрмін уводу — да 1 верасня 2018 года. Кіраўнік урада падкрэсліў, што ўсё неабходнае для своечасовага завяршэння работ ёсць, фінансаванне ідзе па графіку.

Работы на яшчэ адным аб'екце — будынку шматпрофільнай спартыўнай залы гульнявых відаў спорту — па даручэнні Андрэя Кабякова трэба скончыць да канца гэтага года. Фінансаванне будоўлі па вуліцы Філімонава вядзецца за кошт крэдытных рэсурсаў Банка развіцця, арыенціровачны кошт у бягучых цэнах — 22,2 млн рублёў. У час Еўрагульняў—2019 аб'ект плануецца выкарыстоўваць у якасці трэніровачнага ў гульнявых відах спорту (гандбол), а таксама пры неабходнасці і ў адзінаборствах (бокс, вольная і грэка-рымская барацьба, дзюдо, самба).

Прэм'ер-міністр таксама наведаў Палац воднага спорту і ацаніў інфраструктуру, якая можа быць задзейнічана пры правядзенні Еўрапейскіх гульняў у Мінску.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

ЗІМОЙ НЕ ЗАМЕРЗНЕМ

Капітальныя рамонты жылых дамоў плануецца выконваць не больш за месяц

Аб гэтым запэўніў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Генадзь ТРУБІЛА. Ён паведаміў, што цяпер на дамах, якія знаходзяцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ, практычна завершаны прафілактычны рамонт сістэм ацяплення і цеплавых пунктаў.

ГАТОЎНАСЦЬ ВЫСОКАЯ

Ужо сёння амаль цалкам выкананы гідраўлічныя выпрабаванні сістэм ацяплення (99%). План па рамонце дахаў выкананы на 91%, стыкаў сценавых панэляў — на 94%, па праверцы прыбораў уліку цеплавой энергіі — на 94%. Работы па цеплавой ізаляцыі выкананы на 100%.

У цэлым па галіне створаны запас у 11,3 тысячы тон паліўнага мазуту ў якасці рэзервовага паліва для газавых кацельняў (100% ад задання), нарыхтавана 1 370 тысяч кубічных метраў драўнянага паліва (77%). Спецыяліст адзначыў, што па стане на 30 жніўня заменена 438,4 км цеплавых сетак, ці 97% ад задання. Капітальна адрамантавана 36 катлоў (92%) і заменена 40 неэканамічных катлоў (57%).

«Арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі зарэгістраваны 41% пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі да работы ў асенне-зімовы перыяд. Падлічана, што лідзіруе па краіне на сёння Гомельская вобласць, дзе атрымана 99% пашпартоў гатоўнасці. Падцягнуцца трэба Гродзенскай і Брэсцкай абласцям», — адзначыў Генадзь Трубіла.

«Падрыхтоўка аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі да работы ў асенне-зімовы перыяд 2017/2018 гадоў знаходзіцца на належным узроўні і будзе завершана ва ўстаноўленыя тэрміны», — сказаў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

ЦЕПЛАВАЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі плануе вынесці на грамадскае абмеркаванне праект нарматыўна-прававога акта аб цеплавой мадэрнізацыі жылога фонду.

«Думаю, калі дакумент будзе гатовы, а гэта будзе ў найбліжэйшы час, мы яго канчаткова шырока абмяркуем сумесна са СМІ, каб людзі разумелі, як неабходна зберагаць цяпло», — удакладніў сваю пазіцыю Генадзь Трубіла.

Праектам прадугледжана, што цеплавая мадэрнізацыя жылля будзе ажыццяўляцца як за бюджэтныя грошы, так і за сродкі насельніцтва. Намеснік міністра нагадаў, што каля 95% жылога фонду Беларусі знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. «Права ўласнасці абавязвае несці адказнасць за сваё жыллё. З улікам таго, што мадэрнізацыя — затратны працэс, прапрацоўваецца магчымасць удзелу насельніцтва», — растлумачыў намеснік міністра. Як паведамлялася раней, для цеплавой мадэрнізацыі жылля ў Беларусі плануецца ў тым ліку прыцягнуць сродкі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця.

Паведамляецца таксама, што міністэрства плануе ўвесці больш жорсткія нормы правядзення капітальнага рамонту жылых дамоў. Пры гэтым тэрміны ажыццяўлення рамонтных работ будуць скарочаныя да аднаго месяца. У хуткім часе час гэты праект будзе апрабаваны ў Мінску, а таксама ў розных абласцях краіны.

СТАЛІЦА АДПАВЯДАЕ

Пашпарты гатоўнасці да асенне-зімовага сезона ў Мінску атрымалі ўсе спажыўцы цеплавой энергіі, што абслугоўваюцца арганізацыямі камунальнай формы ўласнасці, паведаміў інжынер ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Ігар Ганчарук. Ён расказаў, што ў межах праведзенага вясновага агляду жыллёвага фонду былі ўдакладнены аб'ёмы работ, сфарміраваныя графікі і планы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы жыллёвага фонду да ацяпляльнага перыяду. Па стане на 1 верасня адрамантавана каля 226,5 тысячы квадратных метраў дахаў (87% ад плана), амаль 128 тысяч метраў пагонных стыкаў сценавых панэляў (92%). Праведзена цеплавая рэабілітацыя больш як 55 тысяч квадратных метраў жылля (94%). Таксама камунальнікі правялі рамонт 664 балконаў (97%). Адрамантавана і паверана каля 2,7 тысячы прыбораў уліку цеплавой энергіі (86,8%), якія знаходзяцца на балансе ЖКГ раёнаў Мінска.

Асаблівая ўвага была ўдзелена праверцы дымавых і вентыляцыйных каналаў у дамах з газавыкарыстоўваючым абсталяваннем.

АВАРЫЙНЫ БАЛКОН

Амаль 22 тысячы балконаў плануецца адрамантаваць у Мінску ў наступныя чатыры гады, паведаміў Ігар Ганчарук.

«Усяго ў 2017—2020 гадах плануецца адрамантаваць 21 789 балконаў, у тым ліку 4 340 балконаў за кошт сродкаў бягучага рамонту і 17 449 іх за кошт сродкаў капітальнага рамонту», — адзначыў інжынер. На тэхнічным абслугоўванні КУП ЖКГ раёнаў Мінска знаходзіцца 3 675 жылых дамоў са 180 413 балконамі, у тым ліку 3 213 жылых дамоў са 151 219 балконамі з тэрмінам эксплуатацыі звыш 40 гадоў. Падчас пазачарговага агляду выяўлена 149 аварыйных балконаў, 253 патрабуюць дэталёвага абследавання з прыцягненнем спецыялізаваных арганізацый, 510 балконаў патрабуюць першачарговага рамонту.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Даслоўна

ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ Ў МІНСКУ ПА МАШТАБЕ І АРГАНІЗАЦЫІ НЕ САСТУПЯЦЬ НАЙБУЙНЕЙШЫМ СУСВЕТНЫМ СПАРТЫЎНЫМ ФОРУМАМ

Янез КАЧЫЯНЧЫЧ, выконваючы абавязкі прэзідэнта Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў:

— Павінен сказаць, што, прыняўшы рашэнне аб правядзенні II Еўрапейскіх гульняў у Мінску, мы зрабілі выдатны выбар. Не толькі таму, што Беларусь паспяхова выступіла ў Баку ў 2015 годзе, дзе заваявала больш за 40 узнагарод, але і таму, што ваша краіна таксама мае добрую спартыўную інфраструктуру, у чым члены ЕАК ужо паспелі не раз пераканацца. Акрамя таго, беларусы моцныя сваімі спартыўнымі традыцыямі, у Мінску ведаюць і ўмеюць арганізоўваць буйныя падзеі. У 2014 годзе тут адбыўся чэмпіянат свету па хакеі, і гэты экзамен вы вытрымалі на выдатна.

Еўрапейскія гульні ў Мінску, я ў гэтым упэўнены, па маштабе і арганізацыі не саступяць найбуйнейшым сусветным спартыўным форумам. На Алімпіядах, напрыклад, большую частку медалёў заваёўваюць менавіта атлеты з Еўропы. І ў 2019 годзе ў сталіцу Беларусі прыедуць многія вядучыя спартсмены, бо ў асобных відах спорту будзе праходзіць кваліфікацыя да XXXII летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа.

Я таксама спадзяюся, што па ліку краін, куды будзе весціся тэлетрансляцыя Еўрагульняў—2019, Беларусь не саступіць Азербайджану. У 2015 годзе спаборніцтвы з Баку трансліраваліся ў 145 краінах. Не ўзнікла і сур'ёзных пытанняў пры рабоце над кантрактам па правядзенні II Еўрагульняў з беларускім бокам, які днямі быў падпісаны ў НАК. Усе зацікаўленыя асобы ведалі ўмовы, на якіх Мінск прыме Еўрагульні, і сёлета толькі адпрацоўваліся дэталі.

Нагадаем, што права правядзення II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе Беларусь атрымала на 45-м пасяджэнні Генеральнай асамблеі ЕАК, якое адбылося ў кастрычніку 2016-га ў Мінску. Падчас правядзення Еўрагульняў чакаецца прыбыццё ў беларускую сталіцу і ўдзел у спартыўных і іншых мерапрыемствах больш чым 4 тысяч спартсменаў.

Спаборніцтвы пройдуць з 21 па 30 чэрвеня 2019 года ў 15 відах спорту: у бадмінтоне, боксе, веласіпедным спорце, веславанні на байдарках і каноэ, дзюдо, каратэ, лёгкай атлетыцы, стральбе з лука, кулявой і стэндавай стральбе, настольным тэнісе. Плануецца разыграць ліцэнзіі на Алімпійскія гульні 2020 года ў Токіа.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога сакратара Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ЛІХАЧА Івана Васільевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Прэзідэнт Малдовы прыпыніў рашэнне ўрада адправіць ваенных на вучэнні НАТА

«У адпаведнасці з канстытуцыяй прыняў рашэнне прыпыніць сённяшнюю пастанову ўрада аб удзеле малдаўскіх вайскоўцаў у ваенных вучэннях ва Украіне», — сказаў Ігар Дадон.

Ён адзначыў, што ўпершыню з моманту ўступлення на пасаду прыняў рашэнне скарыстацца канстытуцыйнымі паўнамоцтвамі, якія прадугледжваюць права прыпынення дзеяння актаў урада, якія супярэчаць заканадаўству, да прыняцця канчатковага рашэння Канстытуцыйнага суда.

«Малдова — нейтральная дзяржава, і малдаўскія вайскоўцы не павінны прымаць удзел у ваенных вучэннях, якія праводзяцца пад эгідай якога б там ні было ваеннага блока. Разам з тым мы не будзем перашкаджаць удзелу малдаўскіх ваеннаслужачых у міратворчых манеўрах пад эгідай ААН», — адзначыў Дадон.

Каментуючы гэтае рашэнне прэзідэнта, прэм'ер-міністр Павел Філіп заявіў у сераду на пасяджэнні ўрада, што не разумее, якія аргументы ёсць у прэзідэнта для блакавання ўдзелу малдаўскіх ваеннаслужачых у вучэннях.

CNN: Клінтан усклала на Сандэрса адказнасць за шкоду яе кампаніі

Хілары Клінтан, якая прайграла прэзідэнцкія выбары ў лістападзе мінулага года Дональду Трампу, у сваёй новай кнізе падвергла крытыцы свайго саперніка ў барацьбе за вылучэнне кандыдатам ад дэмакратычнай партыі на пасаду прэзідэнта — сенатара ад штата Вермонт Берні Сандэрса.

Як паведаміла тэлекампанія CNN, Клінтан сцвярджае, што выпады Сандэрса ў яе адрас у ходзе перадвыбарнай кампаніі «нанеслі доўгатэрміновую шкоду» яе шанцам дабіцца перамогі. «На працягу ўсяго перыяду першасных выбараў кожны раз, калі я спрабавала даць адказ на выпады Берні, мне раілі праяўляць стрыманасць, — гаворыцца ва ўрыўку, прыведзеным тэлекампаніяй. — Прэзідэнт Абама заклікаў мяне сціснуць зубы і пазбягаць Берні, як толькі магчыма. Я адчувала сябе як у кайданах».

Абэ на перамовах з Пуціным хоча дамагчыся прагрэсу ў заключэнні мірнага дагавора

Прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ на маючых адбыцца 7 верасня ва Уладзівастоку перамовах з прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным хоча дамагчыся прагрэсу ў пытанні заключэння мірнага дагавора. Пра гэта кіраўнік японскага ўрада заявіў у сераду напярэдадні сваёй паездкі ў Расію.

«Дадаўшы яшчэ большай канкрэтыкі ў сумесную эканамічную дзейнасць на паўночных тэрыторыях (так у Японіі называюць расійскія Паўднёвыя Курылы. — **Заўв. ТАСС**) і зрабіўшы наведванне гэтых тэрыторый іх былымі жыхарамі яшчэ больш свабодным, я хачу дамагчыся прагрэсу ў вырашэнні праблемы мірнага дагавора», — заявіў Сіндза Абэ журналістам у Токіа, пасля чаго на ўрадавым самалёце адправіўся ва Уладзівасток. Ён таксама выказаў намер абмеркаваць з расійскім прэзідэнтам праблему КНДР, якая 3 верасня правяла чарговае ядзернае выпрабаванне.

■ Блізкая ўлада

РАСКЛАД РУХУ АЎТОБУСА І НІЧЫЙНАЯ СЦЯНА РАЗЛАДУ

У горадзе Высокае Камянецкага раёна правёў прыём грамадзян памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Брэсцкай вобласці Васіль ГЕРАСІМАЎ

Насуперак прагнозам па пытаннях працаўладкавання быў толькі адзін зварот. Першы на прыём да памочніка кіраўніка дзяржавы прыйшоў Аляксандр Анішчук з вёскі Доўбізна. Нядаўні выпускнік ВНУ вось ужо паўгода не можа знайсці работу самастойна. Да гэтага ён працаваў інжынерам-праграмістам у адміністрацыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». У ходзе прыёму хлопцу прапанавалі работу па спецыяльнасці ў аграрным каледжы. З будынка гарвыканкама ён накіраваўся на гутарку з будучым работадаўцам. Пасля заканчэння прыёму мы сустрэліся з Аляксандрам, ён быў у прыўзнятым настроі. Сказаў, што пытанне канчаткова вырашыцца на наступны дзень, і хутчэй за ўсё, гэты дзень стане для яго рабочым.

Большасць з астатніх зваротаў датычыліся добраўпарадкавання і сацыяльных аспектаў жыцця былога райцэнтра. І вырашаюцца праблемы, як аказалася, не так паспяхова, як у першым выпадку.

Валянціна Лісіцкая прыйшла з пытаннем, якое спрабуе вырашыць з 2009 года. За гэты час, паводле яе слоў, памяняліся два кіраўнікі Высокага, два старшыні Камянецкага райвыканкама, два дырэктары каледжа, а праблема ні з месца. Сутнасць сапраўднай навалы для гаспадыні дома ў тым, што пры будаўніцтве інтэрната аграрнага каледжа (будынка па суседстве з домам заяўніцы) нечага не ўлічылі. І для замацавання канструкцыі пазней паставілі падпорную сцяну. Паставіць паставілі, а на баланс гэту пабудову ніхто не ўзяў. Фактычна яна нічыйная. Гэтая самая сцяна разладу правакуе сцёк вады з дарогі проста на ўчастак да Валянціны Іванаўны. Асабліва зімой, калі снег растае пад уздзеяннем солі, якой шчодра пасыпаюць дарогу, усё гэтае месіва цэлым патокам пападае на двор гаспадыні. Яна кажа, што не толькі зямлю вада зрабіла непрыгоднай для агарода, яна падтоплівае і разбурае дом 1905 года пабудовы. Жанчына ходзіць па ўстановах, а ёй ужо прапанавалі ісці ў суд, каб судом прымусіць некага прызнаць сябе балансатрымальнікам той злашчаснай сцяны. Па логіцы, калі навучальная ўстанова належыць аддзелу адукацыі, то і сцяна іхняя. Але ж ці справа грамадзяніна ўстанаўліваць гаспадароў суседняй пабудовы? Васіль Герасімаў строга ўказаў на недапушчальнасць такой валакіты і даручыў вырашыць нарэшце гэта пытанне.

Былі звароты наконт правядзення ліўневай каналізацыі, а таксама каналізацыйных сетак, вулічнага асвятлення, гандлю. Раіса Галецкая ўзняла праблему жыхароў вёсак высокаўскай зоны, якія размешчаны побач з Воўчынам, Агароднікамі. Да райцэнтра ім дабірацца выходзіць пад сто кіламетраў. Таму што гэтыя людзі вымушаныя ехаць адразу ў Брэст, а потым у Камянец. Прамыя аўтобусы не ходзяцца. Нават узяць медыцынскую даведку, калі справа датычыцца падрабязнага медагляду, становіцца праблемай. Можа, сапраўды гэтых людзей варта прымацаваць да медустаноў Брэста. Хоць, зразумела, што апошняе вельмі складана.

Памочнік прэзідэнта выслухаў 10 грамадзян. Пасля прыёму Васіль Герасімаў сказаў журналістам, што прыём абазначыў шэраг праблем. Адны з іх часткова вырашацца падчас падрыхтоўкі да абласных дажынак, якія пройдуць тут налета. Іншыя звязаны са стылем работы чыноўнікаў на месцах. Ім трэба вучыцца гаварыць з людзьмі, а таксама своечасова інфармаваць насельніцтва і ўважліва ставіцца да зваротаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Энергія маладосці

БЕЗ ГУЧНЫХ СЛОЎ!

Марафон мерапрыемстваў, прысвечаных 15-годдзю грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», праходзіць гэтымі днямі ў нашай краіне.

Як адзначаюць у арганізацыі, самая вялікая яе каштоўнасць — гэта каманда Саюза моладзі, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах каля паўмільёна неабыякавых юнакоў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 31 года: тых, хто не жадае сядзець склаўшы рукі, а гатовы прыкласці свае сілы і выкарыстаць здольнасці для таго, каб зрабіць жыццё (і сваё, і сваіх аднагодкаў) больш яркім, цікавым і асэнсаваным.

За брэндам «БРСМ» сёння стаіць цэлы шэраг знакавых праектаў патрыятычнай накіраванасці: «Кветкі Вялікай Перамогі!», «Адкрыты дыялог», «Дзень вышыванкі» і іншых. БРСМ — гэта таксама рух маладзёжных атрадаў аховы правапарадку, які аб'яднаў больш як 15,5 тысячы маладых людзей. Арганізацыя другаснай занятасці моладзі і студатрадаўскі рух. 35 тысяч валанцёраў руху «Добрае сэрца», якія аказваюць дабрачынную дапамогу ветэранам, маладым інвалідам, дзецям-сіротам, дапамагаюць аднаўляць і добраўпарадкаваць храмы, працуюць на міжнародных спартыўных мерапрыемствах. БРСМ — гэта праекты «100 ідэй для Беларусі» і «100 ідэй для СНД», «Уладар сяла» і «Алімпія», «Студэнт года» і «Акадэмія мужнасці», маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, шматвектарнае маладзёжнае супрацоўніцтва (міжнародныя лагеры «Бе-La-Русь», «Дружба», міжнародны конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева Вясна», фестываль «Моладзь за Саюзную дзяржаву»)...

Учора, у дзень святкавання 15-годдзя грамадскага маладзёжнага аб'яднання, у рамках дабрачыннай акцыі «950 добрых спраў» мінская гарадская арганізацыя БРСМ падарыла свята выхаванцам дзіцячага дома №5 г. Мінска. Падчас акцыі адбыўся «Адкрыты дыялог» з удзелам кіраўнікоў Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ розных гадоў, якія падзяліліся з юнакамі і дзяўчатамі сакрэтам поспеху і расказалі, як не памыліцца з выбарам будучай прафесіі.

Моладзь Брэста адзначыла 15-годдзе БРСМ працоўнай акцыяй на будоўлі маладзёжнага патрыятычнага цэнтра. Маладзёжны дэсант займаўся добраўпарадкаваннем тэрыторыі і навядзенням парадку ўнутры памяшкання.

У Баранавіцкім раёне пройдуць форум-пляцоўка для маладзёжных лідараў Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, велапрабег, працоўная акцыя і круглы стол з ветэранамі камсамольскага руху.

Віцебскія актывісты БРСМ правядзяць гэтымі днямі акцыю «15 добрых спраў» з наведваннем выхаванцаў дзіцячага дома, арганізацыяй святочнай праграмы для пацыентаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў, аказаннем адраснай дапамогі дзецям са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў у рамках акцыі «У школу з добрым сэрцам!» Асобны кірунак работы — аказанне дапамогі ў аднаўленні храмаў Святой Таццяны і Святога Апостала Андрэя Першазванага, добраўпарадкаванне тэрыторыі ясляў-сада №7 і алеі ў Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў у абласным цэнтры.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Напярэдадні

Знайдзіце дзесяць адрозненняў

У сталіцы адкрылася фотавыстава «Параўнай Мінск»

У холе гандлёвага цэнтра Galleria Minsk прадстаўлена больш за 50 выяў беларускай сталіцы за апошнія сто гадоў. Большасць з іх зрабілі фотакарэспандэнты Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Дарэчы, менавіта БелТА выступіла з ініцыятывай арганізаваць выставу — фотаздымкі ў электронным варыянце можна паглядзець на сайце агенцтва, гэта адзін з раздзелаў мультымедыйнага спецпраекта, прысвечанага 950-годдзю Мінска.

Адметнасцю выставы стала тое, што фатаграфіі мінулых дзесяцігоддзяў размяшчаюцца побач з цяперашнімі выявамі гэтых жа месцаў. Знайсці можна ўсе ключавыя кропкі сталіцы — Траецкае прадмесце, Верхні горад, праспекты Незалежнасці і Пераможцаў, Камсамольскае возера і многія іншыя любімыя мінчанамі куткі горада.

— Выстава выдатная! Я абсалютна ўпэўнены, што не толькі моладзі, але і жыхарам сталага пакалення будзе цікава, якім быў стары горад, як ён аднаўляўся і якім з'яўляецца на сённяшні дзень, — падзяліўся ўражаннямі ад экспазіцыі **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ**.

Кіраўнік Цэнтральнага раёна Ігар БУЗОЎСКІ адзначыў, што выстава — гэта добры спосаб прыцягнуць інвестыцыі, турыстаў, абудзіць цікавасць да тых аб'ектаў, якія ствараюць эканоміку як раёна, так і горада ў цэлым. Ён прапанаваў школьнікам, якія таксама прысутнічалі на адкрыцці, паказаць сваё бачанне горада праз фотаработы, лепшыя з якіх будуць узнагароджаныя і, магчыма, таксама прадстаўлены ў грамадскай прасторы. А пакуль можна заняцца знаёмствам з выставай «Параўнай Мінск», якая прадоўжыцца да канца кастрычніка.

❍ У тэму

«ВОДНА-ЛАЗЕРНАЕ ШОУ НАВЕДАЮ АБАВЯЗКОВА»

Мэр Мінска параіў, куды схадзіць на Дзень горада

Акрамя фотавыставы, якая адкрылася ў Галерэі, у Мінску праходзяць дзясяткі, а то і сотні падзей, прымеркаваных да юбілею сталіцы. Андрэй Шорац расказаў журналістам пра найбольш відовішныя на яго погляд:

— У пятніцу я абавязкова пайду на водна-лазернае шоу. Думаю, што ўсім будзе цікава паглядзець, як хіты, у тым ліку і сусветныя, у пэўнай інтэрпрэтацыі ў выкананні сімфанічнага аркестра прагучаць пад шоу фантанаў у колеры лазера. У суботу ў планах — фестываль гістарычнай рэканструкцыі, на які прыедуць удзельнікі з 16 краін. Абяцаюць насычаную праграму на два дні.

Яшчэ кіраўнік Мінгарвыканкама запрасіў жыхароў і гасцей сталіцы наведаць у суботу пляцоўку каля Палаца спорту. Там увесь дзень будзе гучаць музыка беларускіх і замежных выканаўцаў, а таксама выступіць Прэзідэнцкі аркестр пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна. А ўвечары неба расквеціць грандыёзны салют, зробяць відовішча яшчэ больш незвычайным падсвечаныя паветраныя шары.

У нядзелю двума галоўнымі мерапрыемствамі стануць Мінскі паўмарафон і Дзень танкіста ў парку Перамогі. Андрэй Шорац заўважыў, што ў парку будзе весціся бітва адначасова на 120 камп'ютарах, а само свята пройдзе ў яшчэ незнаёмым для мінчан цікавым фармаце.

Пасля наступных выхадных маштабныя падзеі не скончацца. Праз тыдзень пройдзе масавае закрыццё мотасезона, а ў канцы верасня Мінск ператворыцца ў цыркавую сталіцу. Да нас з'едуцца высакакласныя прафесіяналы з 26 краін. Фестываль будзе доўжыцца тры дні і завершыцца гала-канцэртам — абяцаюць ўзровень не ніжэй, чым у Монтэ-Карла.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■ Здарэнне

Святло згасла на гадзіну

Каля адзінаццаці гадзін дня ў сераду згасла святло на захадзе Мінска — у густанаселеных мікрараёнах Сухарава, Кунцаўшчына і Каменная Горка. Адключэнне электрычнасці закранула і гарады Дзяржынск і Заслаўе. Адбылося гэта з-за няштатнай сітуацыі на сталічнай ТЭЦ-4.

Як праінфармавала ў сваім Твітары Мінскае гарадское ўпраўленне па надзвычайных сітуацыях, віноўнікам здарэння стаў трансфарматар, які разарваўся без узгарання. Чаму гэта адбылося, пакуль высвятляецца.

Паўза ў энергазабеспячэнні выклікала, сярод іншага, прастой некаторых тралейбусных маршрутаў. Згодна з інфармацыяй ДП «Мінсктранс», на лінію часова замест іх выйшлі аўтобусы.

Як паведамілі ў РУП «Мінскэнерга», апоўдні электразабеспячэнне было адноўлена для ўсіх спажыўцоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

Пачытайце састаў ёгурту...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Харчовая прамысловасць выкарыстоўвае нашу асаблівасць лічыць, што прадукт здаецца смачнейшым, калі ў ім шмат солі. Гэтым грашаць усе без выключэння вытворцы, якія вырабляюць мясныя паўфабрыкаты: каўбасы, сасіскі і г. д. Але спецыялісты запэўніваюць, што калі паменшыць канцэнтрацыю солі ў рэцэптуры мясной прадукцыі на 40%, то чалавек гэтага нават не заўважыць. А цяпер уявіце, наколькі перавышае ўсе межы канцэнтрацыя солі ў гэтых прадуктах сёння!

Дзмітрый Шаўцоў адзначае, што існуе прамая залежнасць паміж залішнім ужываннем солі і гіпертанічнай хваробай. Сутачная доза солі — пяць грамаў, гэта чайная лыжачка. А колькі яе спажываем мы? Звычайна нашмат перавышаем гэты парог. Гэта пагражае ростам выпадкаў захворвання гіпертаніяй і яе ўскладненняў, такіх як інсульт і інфаркт міякарда. Не сакрэт, што гэтыя грозныя захворванні ў нас нашмат памаладзелі. І калі мы зменшым ужыванне солі, то гэтыя захворванні могуць альбо прыйсці да чалавека значна пазней, альбо зусім не наступіць, лічыць наш суразмоўца.

Вядома, соль або той жа цукар — не атрута. Іх можна і трэба ўжываць. Небяспечнымі яны становяцца, калі перавышаць меру. Значыць, трэба вучыць грамадства правільнаму харчаванню. «Наша Міністэрства аховы здароўя шмат гаворыць аб тым, што мы павінны абмежоўваць у рэцэптуры колькасць солі і цукру», — адзначае дэпутат.

Але, напрыклад, абмежаваць ужыванне солі ў ежы зусім не так проста, як здаецца на першы погляд. Бо, як сцвярджаюць спецыялісты, да 70% ад усёй спажываемай намі солі ўтоена ў прадуктах, падвергнутых тэхналагічнай апрацоўцы, — каўбасе, кансервах, хлебе, сыры, розных паўфабрыкатах — а значыць, знаходзіцца па-за зонай кантролю спажыўца. І толькі каля 30% гэтага элемента мы дадаём у ежу самі пры гатаванні. Так, можна сказаць: «Давайце есці толькі тую ежу, якую мы згатавалі самі». Але на практыцы — гэта амаль нерэальная рэч.

У ЗША адзін час спрабавалі «выхоўваць» спажыўцоў, праводзячы тлумачальную работу з насельніцтвам наконт небяспекі лішку солі ў рацыёне. Поспеху не было. Цяпер Упраўленне па кантролі за прадуктамі і лекамі ЗША падымае пытанне аб тым, каб заканадаўча знізіць утрыманне солі ў некаторых прадуктах, увёўшы жорсткія абмежаванні на яе ўтрыманне ў мучных вырабах, соусах і іншых шырока распаўсюджаных прадуктах. Услед за амерыканцамі задумаліся над гэтым і еўрапейцы.

У большасці краін пакуль што толькі ідуць дыскусіі на згаданую тэму, а вось Партугалія ўжо зрабіла пэўныя крокі ў гэтым кірунку. Партугальцы традыцыйна спажываюць шмат хлеба. Але большасць гатункаў утрымлівала вельмі шмат солі — ад 18 да 21 грама ў на кілаграм прадукту. І партугальскія ўлады на заканадаўчым узроўні вырашылі змяніць патрабаванні да яго вытворчасці: парламент прыняў закон, які абмяжоўвае максімальную колькасць солі ў кілаграме хлеба — не больш за 14 грамаў. Вынік не прымусіў сябе чакаць: за пяць гадоў у Партугаліі колькасць хворых з павышаным ціскам паменшылася на 5%!

ЗАЛІШНЯЯ колькасць цукру таксама вельмі шкодная для нас. У першую чаргу таму, што аказвае таксічнае дзеянне на сасуды. «Пры гэтым у чалавека наступаюць розныя эндакрынныя парушэнні, — кажа Дзмітрый Шаўцоў. — Часцей за ўсё пакутуе падстраўнікавая залоза, якая выпрацоўвае інсулін. Мы ўсе чулі аб цукровым дыябеце. Ад яго сёння ўжо ніхто не памірае, але якасць жыцця можа значна пагоршыцца. Чалавек пастаўлены ў вельмі жорсткія рамкі, крок налева або направа — і наступствы ў выглядзе рэзкага пагаршэння стану не замарудзяць праявіцца. А вазьміце такое ўскладненне як дыябетычная ступня — гэта такая вільготная гангрэна, калі ў жывым арганізме пачынаюць гніць і паміраць тканкі. Паражаюцца сасуды, і не толькі ног, але і нырак, печані, сэрца, галаўнога мозга...».

Яшчэ раз падкрэсліваем: ніхто нікога не заклікае кідацца ў крайнасці. Не трэба адмаўляцца ад солі і цукру. Проста ўсё павінна быць у меру. Але, на жаль, людзі любяць салодкае і салёнае. І вытворцы ахвотна ідуць ім у гэтым насустрач. Пачытайце склад ёгурту, які вы купляеце сабе ці сваім дзецям. У 100 грамах звычайнага ёгурту — да 13, а часам і больш грамаў цукру! Вытворцы проста шпігуюць нас ім!

А калі вы вырашыце азнаёміцца са складам печыва, то практычна ў кожным гатунку акрамя цукру выявіце яшчэ і маргарын. Між тым транстлушчы, якія змяшчаюцца ў маргарыне, павышаюць утрыманне ў крыві «дрэннага» халестэрыну і зніжаюць узровень «добрага», тым самым спрыяючы развіццю атэрасклерозу. Даказана, што спажыванне транстлушчаў на 32% павышае рызыку ўскладненняў пры ішэмічнай хваробе сэрца. Акрамя таго, транстлушчы спрыяюць павышэнню рызыкі атлусцення і метабалічнага сіндрому, а таксама цукровага дыябету.

У некаторых краінах ужо дадумаліся да таго, што сталі ўводзіць падатак на шкодную ежу. Першай такой краінай у Еўропе стала Данія. У Венгрыі быў прыняты «падатак на чыпсы». Падобныя падаткі ці акцызы паспяхова дзейнічаюць у Вялікабрытаніі і ЗША. Заклікі ўвесці такі падатак неаднаразова гучалі і ў ААН — у 2012 годзе аб гэтым гаварылася ў дакладзе па праблемах харчавання. На думку спецыялістаў ААН, увядзенне падатку на шкодныя прадукты прывядзе да зніжэння іх ужывання.

Не, мы зусім не заклікаем уводзіць падобныя падаткі і ў нас, але ўздымаць пытанне аб тым, як абмежаваць шкодныя прадукты ў рацыёне, асабліва дзіцячым, трэба. Вядома, неабходна вучыць грамадства правільнаму харчаванню. Але на людзей і іх харчовыя звычкі паўплываць вельмі складана, а вось уплываць на вытворцаў — можна. Напрыклад, прымусіць іх рабіць абавязковую маркіроўку прадукцыі, якая змяшчае транстлушчы. Падрабязна ўказваць склад прадукту — і не дробным шрыфтам, які немагчыма прачытаць, а з выкарыстаннем інфаграфікі, максімальна зразумелай усім спажыўцам. Або заканадаўча абмежаваць колькасць солі і транстлушчаў у некаторых прадуктах шырокага спажывання.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Будзь у курсе!

ХТО НЕ ЗМОЖА ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА ШКОЛЬНЫ АБЕД ПРАЗ АРІП?

З 1 верасня большасць сталічных школ перайшла на аплату школьнага харчавання спосабам безнаяўнага разліку.

Плацеж можна здзяйсняць праз сістэму АРІП, але ў шэрагу сталічных школ для гэтых мэтаў выкарыстоўваецца «Карта навучэнца». Таму на сайце АРІП растлумачылі механізм унясення платы за школьнае харчаванне.

Калі асабовы рахунак вучня (уліковы нумар вучня) складаецца з дзесяці знакаў, гэта азначае, што бацькі могуць аплачваць школьнае харчаванне праз сістэму АРІП у любы час і любым зручным для іх спосабам — праз усю плацежную інфраструктуру АРІП: гэта можна зрабіць праз касы банкаў і банкаматы, інтэрнэт-банк, мабільны банкінг ці інфакіёскі.

Для правядзення плацяжу неабходна выбраць пункт «сістэма «Разлік» (АРІП), г. Мінск», далей раздзелы «адукацыя і развіццё», «камбінат школьнага харчавання», «раён (да якога належыць установа адукацыі)» і «харчаванне». Потым трэба ўвесці ўліковы нумар вучня (10 лічбаў), суму плацяжу, праверыць карэктнасць інфармацыі і здзейсніць плацеж.

Калі ж у школе ў якасці асабовага рахунку для аплаты харчавання дзіцяці далі 16-значны ўнікальны нумар (ён жа нанесены на «Карту навучэнца»), то праз АРІП плацеж нельга будзе правесці.

На сайце АРІП тлумачаць: уліковы нумар прысвойваецца вучню адзін раз, захоўваецца за ім да моманту заканчэння школы і больш нікому ніколі не перадаецца. Нумар можа змяняцца толькі пры змене ўстановы адукацыі.

Ніякіх камісій пры аплаце школьнага харчавання праз сістэму «Разлік» з бацькоў не спаганяецца, як не спаганяюцца яны сістэмай з плацельшчыкаў і пры любых іншых плацяжах праз АРІП.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Пытальнік

НАПРАМАК НА «ЛУКАМОР'Е» ЗНОЎ У БЯСПЕЦЫ

Дарожныя знакі пасля звароту ў «Звязду» вярнулі «экспрэсам»

Перад скрыжаваннем каля садовага таварыства «Экспрэс» аўтадарогі Н-8941 Пятрышкі—Радашковічы пасля ДТЗ з цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі пешахода былі ў 2016 годзе ўстаноўлены два знакі 3.24.1 «Абмежаванне максімальнай хуткасці — 50 км/г». Нядаўна дачнікі выявілі знікненне дзяржаўнай маёмасці — згаданых знакаў. Пазней адзін з іх быў знойдзены ў лесапасе. ДРБУ №194 (г. Заслаўе) вядома пра «безгаспадарчы» знак. Вуснае абяцанне аднавіць становішча знака дарожнікамі не выканана. Падчас даследчай праверкі было ўстаноўлена, што меры забеспячэння бяспекі руху дачнікаў, турыстаў, веласіпедыстаў, якія рухаюцца да Вязынкі ў музей, не прадпрымаюцца.

Названае скрыжаванне з'яўляецца месцам высадкі дачнікаў садаводчых таварыстваў «Экспрэс» і «Лукамор'е-2», якія налічваюць больш за 500 участкаў. Штодня аўтобусы спыняюцца на скрыжаванні 22 разы. Адзінаццаць разоў у дзень дачнікі, што высадзіліся з аўтобусаў або бягуць да іх, падвяргаюць сябе небяспецы, перасякаючы ва ўмовах абмежаванай бачнасці дарогу, на якой зняты абмежаванні хуткасці аўтамабіляў. А многія ж прыязджаюць з дзецьмі. Па віне вандалаў небяспецы ДТЗ беспакарана падвяргаецца мноства людзей.

М. А. ЖУКОЎСКІ, *г. Мінск*

Паколькі ў звароце чытача была інфармацыя пра тое, што дарожнікі працяглы час ігнаруюць выкананне сваіх абавязкаў па вяртанні знакаў на ранейшае месца, мы вырашылі пайсці іншым шляхам — звярнуліся па дапамогу ва ўпраўленне Дзяржаўтаінспекцыі УУС Мінаблвыканкама. Неўзабаве атрымалі адтуль афіцыйнае рэагаванне.

«Паведамляем, што заява... аб нездавальняючых дарожных умовах на аўтамабільнай дарозе Н-8941 Заслаўе—Пятрышкі—Радашковічы паблізу садаводчага таварыства «Экспрэс», звязаных з адсутнасцю дарожных знакаў 3.24.1 «Абмежаванне максімальнай хуткасці» (50 км/г), уважліва разгледжана УДПІ УУС Мінаблвыканкама.

Праведзенай праверкай з выездам на месца ўстаноўлена, што па стане на 15 гадзін 21.08 вышэйназваныя знакі адсутнічаюць.

За невыкананне патрабаванняў п. 209.1 Правілаў дарожнага руху Рэспублікі Беларусь у адносінах да службовай асобы, адказнай за ўтрыманне аўтадарогі Н-8941 Заслаўе—Пятрышкі—Радашковічы быў складзены пратакол аб адміністрацыйным парушэнні ў адпаведнасці з арт. 18.38 КоАП Рэспублікі Беларусь.

Цяпер забараняючыя дарожныя знакі 3.24.1 «Абмежаванне максімальнай хуткасці» (50 км/г) адноўленыя ў адпаведнасці з праектам арганізацыі дарожнага руху.

Упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці выказвае ўдзячнасць за ваша ўважлівае стаўленне да праблем забеспячэння бяспекі руху».

І літаральна ў той жа дзень па электроннай пошце рэдакцыя атрымала яшчэ адно пасланне — ад згаданага вышэй заяўніка Мікалая Жукоўскага, якое назвалася «Аб шчаслівай руцэ супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «Звязда». Ну, наконт апошняга чытач некалькі эмацыянальна перабольшыў, бо мы ў сваёй рабоце са зваротамі грамадзян кіруемся не ўдачай і шчаслівай рукой, а заканадаўствам.

«Дзякуючы своечасоваму ўмяшанню чацвёртай улады дзяржавы — прэсы — на дарозе Н-8941 адноўлены выламаныя хуліганамі дарожныя знакі. Ужо на другі дзень пасля звароту рэдакцыі газеты «Звязда» ў абласное ДАІ яе супрацоўнік правёў агляд дарогі, склаў пратакол у адрас ДРБУ, і 24 жніўня знакі паўторна засцераглі ад небяспекі дарожны рух. Вялікі дзякуй ад дачнікаў таварыстваў «Экспрэс» і «Лукамор'е» (Мінскі раён, Вязынка — Кісялі)».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Новыя кнігі

Парушыць межы ценяў

У склад Саюза пісьменнікаў Беларусі ўваходзяць і калегі з іншых краін свету — Азербайджана, Арменіі, Аўстрыі, Балгарыі, Германіі, ЗША, Іспаніі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Таджыкістана, Украіны. Як правіла — гэта нашы суайчыннікі альбо літаратары, якія настойліва прапагандуюць беларускую літаратуру ў сваіх краінах. Сярод такіх рупліўцаў — і ўраджэнец Магілёўшчыны, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі», сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Казакоў. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» днямі пабачыла свет кніга расійскага і беларускага літаратара «Цень гобліна».

Пад цікавай, маляўнічай вокладкай — аднайменны раман, у якім расказваецца пра сучаснасць, пра тое, як развальваецца свет і якія сілы часцяком вядуць свой рэй. Валерый Казакоў па адной са сваіх адукацый — сацыёлаг, кандыдат навук. Дарэчы, абараняўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пісьменнік зазірае ў сутнасць грамадскіх, палітычных з'яў, імкнецца высветліць, што ж чакае чалавецтва, грамадства, калі супольна не супрацьстаяць антыгуманізму. Чытаючы прозу Валерыя Казакова, неўпрыкмет праводзіш паралелі з прачытаным, з тым, што некалі ўразіла, захапіла, прымусіла настойліва разважаць, магчыма, нават спрачацца не толькі з аўтарамі, але і з самім сабою. І было гэта перш-наперш пасля знаёмства з раманамі і аповесцямі Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Уладзіміра Караткевіча, Алеся Жука, Анатоля Кудраўца, Міхася Стральцова, Вячаслава Адамчыка, Янкі Брыля... Адкрыйце старонкі «Ценю гобліна» — і вы пераканаецеся, што варта «пісаць пра чалавека ва ўсіх яго праявах» і «суперажываць на мяжы эмацыянальнага напружвання» (Алесь Адамовіч).

Сяргей ШЫЧКО.
shychko@zviazda.by

Сямейная газета

Выпуск №17 (84)

СЕЛЯДЗЕЦ ПАД ФУТРАМ

Днямі нам з мужам па пошце прыйшлі сланечнікі. І не адкуль-небудзь, а з Парыжа. Нашага, беларускага. Калі хто яшчэ не ведае, ёсць вёсачка з такой назвай на Віцебшчыне.

Справа ў тым, што нашы сябры сёлета вырашылі не ехаць за мяжу, а правесці свой адпачынак у вандроўках па Беларусі. Наведалі ўжо Бычкі Быкава,Ушачы Барадуліна, паплавалі ў Браслаўскіх азёрах, падыхалі чыстым паветрам балота Ельня. І, як вы ўжо зразумелі, дабраліся нават да Парыжа. Відаць, ім там было так добра, што вырашылі падзяліцца сваім шчасцем з кімсьці яшчэ. Зайшлі на пошту, купілі беларускамоўную паштовачку з сонечнымі сланечнікамі і даслалі нам «прывітанне з нашага беларускага Парыжа». Ад такога клопату ў мяне на душы стала сонечна.

Тая парыжская паштоўка нагадала мне іншую гісторыю — пра керамічную масленіцу, размаляваную сланечнікамі. У адзін цудоўны вечар муж вярнуўся ад бацькоў з Віцебска. Я была ў пакоі, калі ён пачаў распакоўваць сумкі. «Ну я ж прасіў...», — пачула я абураны голас з кухні. Аказваецца, Вова прасіў маці не класці масленіцу, бо маем ужо адну. І другая нам не патрэбна. Але яна, відаць, усё адно паклала. «І так паўтараецца кожны раз. Я ўжо не ведаю, што рабіць. Мая маці мяне не чуе. Адчуваю сябе «згвалтаваным» яе клопатам». У той вечар муж расказаў мне, як аднойчы ён ледзь дацягнуў дадому скрыню з буракамі, якія маці даслала па пошце, бо перажывала, што сыну няма чаго есці. «А аднойчы перад маім ад'ездам у Мінск яна запыталася: «Табе ж пакласці селядзец пад футрам?» Я, вядома, адказаў «не», бо я яго не ем. І расслабіўся. А дарэмна. Дарэмна не праверыў, не пракантраляваў, бо адгадай, што чакала мяне дома ў пакеце пад кантэйнерам з піражкамі? Правільна, ЁН самы!»

Нашы з мужам мамы вельмі падобныя. Абедзве гатовыя аддаць дзецям апошняе. Раней я рэагавала на такі клопат прыблізна так, як і Вова. Раздражнялася, калі мама перадавала мне такую колькасць закрутак, якую з'есці адной ну проста нерэальна. Злавалася, калі яна штовечар пыталася: «А што ты сёння ела?» Ці прасіла: «Апранайся цяплей», «Патэлефануй, як дабярэшся дадому». Але дзякуючы мужу паглядзела на сябе збоку. І памяняла тактыку.

Зразумела, што матуль мы не ў сілах змяніць. А вось сваю рэакцыю на такое праяўленне любові можам. Замест таго каб раздражняцца і крыўдзіць іх сваім незадаволеным «ну я ж прасіў(-ла)», лепш проста з удзячнасцю прыняць клопат. Парадавацца, што як мінімум двум людзям на свеце важна ведаць ва ўсіх падрабязнасцях, ШТО мы сёння елі.

Ды і селядзец пад футрам не варты таго, каб крыўдзіцца на маму. Тым больш сярод вашых знаёмых дакладна знойдуцца людзі, якія абажаюць гэтую салату. Можна запрасіць сяброў у госці і пачаставаць іх мамінымі фірмавымі агурчыкамі, што я перыядычна і раблю. І потым прапанаваць камусьці з іх прыгожую масленіцу са сланечнікамі.

Я, дарэчы, так і зрабіла. Масленіцу, якая так узрушыла мужа, аддала каляжанцы. Яна вельмі абрадавалася такому падарунку. Больш за тое, на наступны дзень забегла да мяне ў кабінет з мабільным тэлефонам, каб паказаць фотаздымак. «Уяўляеш, учора дома на антрэсолях знайшла заварнік ды абрус з такімі ж сонечнымі сланечнікамі, як і на тваёй масленіцы». Убачыла я гэты сланечнікавы нацюрморт, і на душы зноў стала сонечна.

«Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў». Уладзімір Караткевіч, відаць, адчуваў прыблізна тое ж самае, калі пісаў гэтыя радкі.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

nadzieja@zviazda.by

■ Тыя, хто побач

РАЙ НА ЗЯМЛІ

ЧАМУ ГАРАДЖАНЕ ВЫРАШЫЛІ ПАДАРЫЦЬ СВАІМ СЫНАМ ВЯСКОВАЕ ДЗЯЦІНСТВА?

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Больш як 8 гадоў таму Мікіта Цэхановіч прыгледзеў на ўскрайку маляўнічай вёскі драўляную хатку. Купіў яе ўсяго за 300 долараў. І пераехаў жыць з Баранавіч у Горную Руту. «Я пачаў шукаць свой рай на зямлі яшчэ да знаёмства з Наташай. Памятаю, саджаў вось гэтыя кусцікі з думкамі, што мае дзеці зранку басанож будуць з дому выбягаць ды сваімі маленькімі пальчыкамі ягадкі рваць. Цяпер усё так і адбываецца».

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Гэта па-нашаму!

«НЕ ЗНАЙШЛІ — ЗРАБІЛІ САМІ»

Як Адэлька натхніла тату і бабулю на стварэнне 3D-канструктара Мірскага замка

Зусім нядаўна ўнікальны экалагічны канструктар з'явіўся на паліцах беларускіх крамаў. Зроблена цацка з трывалага кардону. Сабраць яе можна з дапамогай інструкцыі прыблізна за дзве гадзіны. Без клею і нажніц. У камплекце, акрамя дэталяў замка, яшчэ і чатыры фігуркі гістарычных асоб таго часу.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Я выбірала ўсіх чалавечкаў, — кажа пры сустрэчы васьмігадовая Адэля Бахун. — Вось гэта Бронны баярын, побач Камандыр, Панна ды Крылаты гусар. З імі дзеткі могуць гуляць у двары кардоннага замка *(паказвае)*.

— Адэлька вельмі любіць персанажаў розных гістарычных эпох, — удакладняе Сяргей Бахун, тата Адэлі, — таму мы ёй пастаянна купляем разнастайныя фігуркі з іх выявамі. У дачушкі гэтых чалавечкаў ажно тры скрыні. Яна ўсіх іх ведае.

— А яшчэ я люблю збіраць розныя канструктары, пазлы.

— Прынамсі, з гэтага яе захаплення ўсё і пачалося. Аднойчы Адэлька папрасіла пазл з якім-небудзь беларускім замкам. Абышлі ўсе дзіцячыя крамы. Там бачылі ўсё што можна — Эйфелеву вежу, Крэмль, Статую Свабоды. Але так і не знайшлі ніводнага канструктара, прысвечанага нашай гісторыі. На выхадныя паехалі з Адэлькай у Брэст праведаць бабулю. Расказалі ёй за гарбаткай пра сваё гора. А яна і кажа: «Не знайшлі, дык давайце зробім самі». Тым больш досвед у нас ужо быў: некалькі гадоў таму мы распачалі невялічкую сямейную справу (Тамара Бахун пасля выхаду на пенсію пры дапамозе сына пачала выпускаць крэатыўныя паштоўкі на беларускай мове. — ***Аўт.***) Рабілі канструктар у першую чаргу для дзетак, таму ва ўсім раіліся з Адэлькай.

— У Беларусі столькі выдатных гістарычных будынкаў. Чаму спынілі выбар менавіта на Мірскім замку?

— Мы апыталі знаёмых. Аказалася, што гэта самая пазнавальная беларуская архітэктурная каштоўнасць. Перад тым як рабіць канструктар, паехалі ў Мір і папрасілі дазволу на выкарыстанне копіі замка. Там нашай ідэі вельмі ўзрадаваліся. І нават прапанавалі заключыць дагавор, каб мець магчымасць прадаваць нашы пазлы ў сваёй сувенірнай лаўцы. Разам з тым, на жаль, далёка не кожны беларус быў у Міры. А вось складуць дома мадэль замка і, спадзяюся, захочуць убачыць яго ў рэальнасці. Збяруцца ў выхадны дзень і паедуць у Мір усёй сям'ёй. Праблема ж у тым, што дзеці цяпер сядзяць у сваіх камп'ютарах, бацькі — у сваіх. Гэта шкодзіць сямейным стасункам... Сёлета я ўпершыню завёз Адэльку ў Мірскі замак. Першае, што яна сказала: «Ух ты! Ён такі вялікі!»

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

ТАТА ЦІ НЕ?

Як у віцебскай лабараторыі пацвярджаюць бацькоўства

Віцебск стаў трэцім абласным цэнтрам пасля Брэста і Гродна, дзе пачалі праводзіць ананімнае даследаванне сваяцтва.

СПАЧАТКУ некалькі непрыдуманых прыкладаў.

Мужчына і яго таварыш, жонка першага і сын прыйшлі на даследаванне. Сябар сям'і пажадаў, каб пацвердзілі яго бацькоўства, бо каханка сказала, што нарадзіла ад яго. Высветлілася, што ні ён, ні законны муж не з'яўляюцца татам дзіцяці.

Бывае, што і мамы хочуць упэўніцца, што дзіця іх роднае. Мо падмянілі ў радзільным доме? У прыватнасці, быў выпадак, калі ў здаровых мужа і жонкі нарадзілася цяжка хворае дзіця. Высветлілася, што гэта менавіта іх сын.

Мужчына, каб забраць дзіця з інтэрната пасля смерці яго мамы, добраахвотна пажадаў вызначыць бацькоўства.

НЕКАЛЬКІ разоў да экспертаў звярталіся замежныя грамадзяне. Першы быў... японец. Хлопчык, як дзве кроплі вады падобны на яго. Мама дзіцяці — беларуска. Але не было дакументаў, якія пацвердзілі б бацькоўства для пераезду сям'і ў Японію. Малы, дзякуючы экспертам, «атрымаў тату».

— З 2014 года праводзяцца экспертызы спрэчнага сваяцтва. І ў любым выпадку патрабавалася прысутнасць усіх зацікаўленых асоб. Размова пра маму, дзіця, мяркуемага бацьку. Сёлета ўжо выканана 100 экспертыз. У 82 выпадках сваяцтва пацвердзілася. А цяпер ёсць магчымасць і ананімнага даследавання, — расказвае **начальнік аддзела судова-біялагічных і судова-генетычных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці Настасся ЗАБАБУХА.**

Праўда, у якасці доказу ў судзе вынік ананімнага даследавання выкарыстоўваць нельга. Але розныя бываюць выпадкі. Напрыклад, муж не верыць у бацькоўства, а сапсаваць стасункі з жонкай не хоча. Або бабуля, напрыклад, не можа заснуць спакойна і просіць сына, каб праверыў...

ДАРЭЧЫ, экспертызы ў дачыненні да больш дальніх сваякоў, тых жа бабуль, праводзяцца толькі ў цэнтральным апараце Дзяржаўнага камітэта ў Мінску.

— Таму што ў два разы складаней вызначыць сваяцтва... Наконт кошту паслугі ў нас: для грамадзян Беларусі — 197,33 рубля, для іншаземцаў — 258,31 рубля, — працягвае суразмоўніца.

Кошт даследавання, дарэчы, панізіўся у параўнанні з 2014 годам. Тады яно каштавала каля 4,5 мільёна «старымі».

Вынік даследавання можна атрымаць цягам 30 дзён.

— Каб выключыць магчымасць недакладнага выніку даследавання, неабходна старанна падысці да працэдуры, — тлумачыць эксперт.

Спатрэбіцца новая ўпакоўка ватных палачак, два чыстыя канверты, кавалак паралону, пара пальчатак і нажніцы. У пальчатках трэба ўзяць 2—3 гігіенічныя палачкі, адзін з канцоў якіх трэба абрэзаць. Ватным тампонам на другім канцы з некаторым высілкам зрабіць саскрэб клетак з унутранай паверхні шчакі. Потым узоры трэба высушыць, змясціўшы іх у паралон ватнымі тампонамі ўверх. І гэта трэба зрабіць ва ўмовах, якія выключаюць уздзеянне сонечных прамянёў, вільгаці, ацяпляльных прыбораў...

Калі ўсё зрабіць правільна, верагоднасць памылкі — 0,0001%.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Сямейная кансультацыя

ДВАЙНОЕ ІМЯ, ШЛЮБ ЗА МЯЖОЙ І РАЗВОД ПА ЗГОДЗЕ

На пытанні адказвае Жанна ЗАХАРАВА, начальнік упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Маці звярнулася ў загс, каб зарэгістраваць маё дзіця. Узнікла пытанне, ці можна даць немаўляці двайное імя? Якое з імён будзе афіцыйным? Якое будзе пазначана ў пасведчанні аб нараджэнні?

Аліна Г., г. Баранавічы

— Так, пры рэгістрацыі нараджэння дзіцяці яму можна прысвоіць двайное імя. У адпаведнасці з артыкулам 69 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (Кодэкса) дзіцяці можа быць дадзена не больш за два ўласныя імені. Імя, занатаванае ў запісе акта аб нараджэнні першым, лічыцца асноўным.

Орган загс не мае права адмовіць у прысваенні малому выбранага бацькамі ўласнага імя, калі толькі яно не супярэчыць нормам грамадскай маралі і нацыянальным традыцыям. Паколькі ў пасведчанні аб нараджэнні падаюцца звесткі, якія ўтрымліваюцца ў запісе акта аб нараджэнні, у графе «ўласнае імя» пасведчання будуць запісаны абодва ўласныя імені дзіцяці.

— Я і мой жаніх — грамадзяне Беларусі, аднак цяпер пражываем у Германіі. Калі мы заключым шлюб у Германіі, ці будзе ён прызнаны ў Беларусі? У далейшым не выключаем пражыванне на радзіме.

Святлана Пятроўна, г. Нясвіж

— Так, шлюб, зарэгістраваны па-за межамі Беларусі з захаваннем формы шлюбу, устаноўленай законам месца яго здзяйснення, будзе прызнаны на тэрыторыі нашай краіны пры ўмове, што ён не супярэчыць патрабаванням артыкулаў 17—19 Кодэкса. Гэты датычыцца шлюбаў за мяжой паміж беларусамі, шлюбаў грамадзян Беларусі з замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства.

Хачу перасцерагчы, што калі ў будучыні вы плануеце пражыванне ў Беларусі, то можаце сутыкнуцца з пэўнымі цяжкасцямі, звязанымі з ажыццяўленнем (пры неабходнасці) такіх адміністрацыйных працэдур, як выдача паўторнага пасведчання аб заключэнні шлюбу, унясенне змяненняў, выпраўленняў дапаўненняў у запіс акта, выдача на падставе запісу акта даведак і іншых дакументаў.

